Меры реализации общества по борьбе с пьянством и бродяжничеством были разные: на государственном уровне КОТ подал несколько прошений ограничить продажу алкоголя, открыть богадельни в Казани и нескольких уездах. Само КОТ смогло открыть 2 чайно-столовые, 2 библиотеки читальни, 3 приюта, 2 ночлежки, 2 медицинских дома и 3 общественно-просветительских объединения [4, с. 198].

Деятельность А. Т. Соловьёва по борьбе с пьянством, бродяжничеством и проституцией сближала КОТ с Русской православной церковью. Сам А. Т. Соловьёв был человеком весьма верующим и считал, что истинно верующие люди не поддадутся соблазнам материальным, человек, поставивший цель своей жизни, пить не будет, вечный труд над собой и для других будет его наслаждением, и у него не будет времени для увеселений и развлечений. С января по декабрь 1900 года А. Т. Соловьёв являлся также первым председателем правления созданного под патронажем КОТ «Общества защиты несчастных женщин в городе Казани», которые в публичных домах занимались проституцией [5, с. 149].

А. Т. Соловьёвым было налажено издание журнала «Деятель», в котором печатались статьи и брошюры по борьбе с пьянством, бродяжничеством и проституцией. КОТ стало настолько популярным, что в 1911 году участвовало на выставке в Турине (Италия), где общество получило гран-при, а сам А. Т. Соловьёв — большую серебряную нагрудную медаль. В годы Первой мировой войны КОТ, помогая раненым и обездоленным, выполняло функции тыловой помощи пострадавшим от войны.

**Заключение.** Деятельность Казанского общества трезвости была направлена на борьбу с пьянством, бродяжничеством и преступностью. Существенно на развитие этого движения повлиял создатель и идейный вдохновитель этой организации А. Т. Соловьёв. Организация имела значительное влияние на администрацию губернии, что выразилось в ряде совместных акций города и Казанского общества трезвости.

**Список цитируемых источников**

1. Алексеев И. Е. Во имя Христа и во славу Государеву (история «Казанского Общества Трезвости» и Казанского отдела «Русского Собрания» в кратких очерках, документах и комментариях к ним). Ч. I. Казань, 2003. 196 с.
2. Костин Ю. В. Особенности развития уголовного права Российской империи в XIX в. // История государства и права. 2010. № 7. С. 22—25.
3. Воинство Святого Георгия. Жизнеописания русских монархистов начала XX века / сост. и ред. А. Д. Степанов, А. А. Иванов. СПб., 2006. 401 с.
4. Святая Русь. Энциклопедия русского народа. Русский патриотизм / гл. ред., сост. О. А. Платонов, сост. А. Д. Степанов. М., 2003 г. 687 с.
5. Алексеев И. Е. Во имя Христа и во славу Государеву (история «Казанского Общества Трезвости» и Казанского отдела «Русского Собрания» в кратких очерках, документах и комментариях к ним). Ч. I. Казань, 2003. 385 с.

Материал поступил в редакцию 28.04.2015 г.

**УДК 930.1**

**А. В. Дземідовіч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ДЗЕЙНАСЦЬ АРМІІ КРАЁВАЙ НА ЛІДЧЫНЕ

**Уводзіны.** «Кто Иван Грозный был — герой или палач» — векавая спрэчка расійскіх гісторыкаў у нашы дні атрымала рэальнае адлюстраванне не толькі на старонках кніг, але і ў грамадска-палітычным жыцці нашых бліжэйшых суседзяў. Грамадска-палітычныя падзеі на Украіне апошніх дзён, звязаныя з дыскусіяй наконт асобы С. Бандэры, вызываюць адметны рэзананс у Беларусі і абуджаюць гістарычную і грамадскую цікавасць да некаторых падзей у нашай краіне, што мае важкае ідэалагічнае значэнне ў палітычным жыцці нашай Бацькаўшчыны. У беларускай гісторыі шмат «белых плямаў», тэндэнцыйных падыходаў, скажоных ацэнак і супярэчлівых высноў.

**Асноўная частка.** «Вахляж» — такую назву атрымала фарміраванне польскіх узброеных сілаў для правядзення дыверсіяў і разведкі на акупаваных немцамі заходніх тэрыторыях СССР. Загадам генерала У. Сікорскага 14 лютага 1942 года. Саюз узброенай барацьбы быў перайменаваны ў Армію Краёву (далей — АК). Быў распрацаваны план пад кодавай назвай «Навальніца». У ваенных адносінах ён быў накіраваны супраць Германіі, у палітычным сэнсе — супраць СССР. У адпаведнасці з гэтым планам узброеныя дзеянні АК павінны былі заключацца ў правядзенні дыверсіяў і праследаванні немцаў. Палітычнай мэтай «Навальніцы» было ўзяць пад свой кантроль важнейшыя ваенныя, прамысловыя, адміністрацыйныя і культурныя цэнтры краіны да вызвалення іх Чырвонай Арміяй ад немцаў і пераняць ўладу ў свае рукі [1, с. 28].

© Дземідовіч А. В., 2015

Тэрыторыя Лідчыны ўвашла у склад чацвёртай зоны дзеяння гэтых антыфашысцкіх сіл. Начальнікам 4-га ўчастка быў прызначаны камандзір З. Рэлішка, які асталяваўся ў Лідзе. Летам 1942 года акаўцы прыступілі да дыверсійных акцыяў на чыгунках Ліда—Маладзечна і Баранавічы—Мінск. Так, 16 ліпеня 1942 года на станцыі Ліда ў цыстэрну з бензінам быў укінуты самаробны запальны зарад. 25 верасня 1942 года на станцыі Ліда былі падсыпаны жалезныя апілкі ў змазачнае масла, якім змазвалі буксы паравозаў. У кастрычніку пад станцыяй Гаўя (Лідскі раён) быў пушчаны пад адхон паравоз і некалькі вагонаў з грузамі. Групе ротмістра «Цыгана» ўдалося прыцягнуць да барацьбы супраць немцаў начальніка мясцовай беларускай паліцыі разам з яго падначаленымі — каля 30 чалавек. Палякаў адразу стала удвая меней сярод падпольшчыкаў, але групы лічыліся польскімі.

Паспяховая дзейнасць польскіх патрыётаў была непрадумана падарвана кіраўніцтвам падполля. Маёр З. Рэлішка не пагадзіўся з кіраўніцтвам наконт пытання аб «абжыванні» Мінска, таму ў хуткім часе ён быў вызвалены ад пасады. Замест З. Рэлішкі начальнікам 4-га ўчастка быў прызначаны маёр Т. Сакалоўскі. Ён адразу перанёс штаб-кватэру ўчастка з Ліды ў Мінск, пачаў безупынна курсіраваць па лініі Баранавічы—Ліда—Варшава, каб найхутчэй падрыхтаваць участак вядзення баявых акцыяў.

Аднак правалы і няўдачы, гібель людзей, часам бяссэнсавая, прымусілі галоўнае камандаванне АК задумацца аб рэарганізацыі «Вахляжа». Так, 17 сакавіка 1943 года быў расфарміраваны штаб арганізацыі, яго каманда перайшла ў розныя структуры Арміі Краёвай. Дзейнасць «Вахляжа» мела вельмі важнае значэнне, бо 8 месяцаў актыўнасці зрабілі прынцыповы перелом у псіхіцы людзей з польскага падполля. «Вахляж» як састаўная частка АК быў першай польскай канспіратыўнай арганізацыяй на Лідчыне, якая перайшла ад слоў да непасрэдных баявых дзеянняў, павяла актыўную барацьбу супраць нямецкіх акупантаў. Прычым барацьба гэтая не абмежавалася аднаразовай акцыяй адной групы, яна ахапіла вялікія тэрыторыі і заняла значны адрэзак часу.

Арганізацыйная сістэма Навагрудскай акругі прадугледжвала падзел на «абводы», адпаведныя паветам у рамках польскага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення да 1 верасня 1939 года Да мая 1942 года Навагрудская акруга ахоплівала 5 паветаў: Шчучынскі, Лідскі, Стаўбцоўскі, Навагрудскі і Валожынскі; 40% жаўнераў Навагрудскай акругі АК — гэта праваслаўныя беларусы [2, с. 41]. А калі да гэтай лічбы дадаць беларусаў-католікаў і так званых тутэйшых, то мы ў нейкай ступені будзем мець сапраўднае ўяўленне пра Армію Краёву на гэтай тэрыторыі.

Першым камендантам акругі быў маёр М. Крайнік. У першапачатковым перыядзе арганізацыяй акругі АК займаліся 92 афіцэры і 250 падафіцэраў. Да лістапада 1942 года арганізацыя акругі была завершана. Абвод Ліда («Бор») узначаліў О. Кушалеўскі.

Першая партызанская група Навагрудскай акругі АК з'явілася ў чэрвені 1942 года. Гэта быў невялікі атрад, якім кіраваў падпаручнік Ян Скорб. У 1943 годзе ў лес выйшлі другія атрады. Як правіла, яны насілі чырвонаармейскую форму, каб не наклікаць збоку немцаў рэпрэсій супраць мясцовага польскага насельніцтва. Менавіта ў такой экіпіроўцы ў лютым 1943 года рушыў з Ліды са сваім атрадам (колькасна пераўзыходзіў батальён) ў ваколіцы Беліцы падпаручнік Стэфан Заянчкоўскі («Рагнар»). Прыкладна ў той жа час ў раёне Лугамовічы—Трабы—Юрацішкі быў створаны 321-ы атрад, якім камандаваў падпаручнік Э. Булак-Балаховіч («Здрой») — сын смутна вядомага на Беларусі з часоў грамадзянскай вайны генерала С. Булак-Балаховіча. У канчатковай фазе свайго існавання Навагрудская акруга налічвала каля 8 000 чалавек непасрэдна ў баявых часцях. Акрамя гэтага, у канспіратыўнай сетцы было задзейнічана больш за 15 тысяч.

Партызаны АК на Лідчыне вялі актыўныя баявыя дзеянні супраць фашыстаў. З першага студзеня 1942 года і да прыходу Чырвонай Арміі фарміраванні АК Навагрудскай акругі правялі 102 узброеныя сутычкі з немцамі. Сапраўды, дакументальна пацверджана, што ў гэты перыяд акаўцы правялі некалькі дзесяткаў лакальных, часам даволі дзёрзкіх акцыяў супраць немцаў і паслугачоў. Напрыклад, налёты на варожыя гарнізоны ў Радуні, Беняконях, Юрацішках, Шчучыне, вызваленне зняволеных лідскай турмы, дыверсіі на лініях камунікацый, знішчэнне штутцпунктаў на скрыжаваннях дарог і г. д. Летам 1944 года былі знішчаны 7 нямецкіх пагранічных заставаў [3, с. 75].

Але барацьба суправаджалася ахвярамі. Так, напрыклад, 16 чэрвеня 1944 года загінуў самы славуты партызан Арміі Краёвай паручнік Ян Піўнік «Пануры». Здарылася гэта пры разгроме нямецкай пагранічнай базы каля Ліды (застава ў Еўлашах). «Пануры» падняў узвод у атаку і са сваім ад'ютантам рабіў кароткую перабежку, у гэты час і быў скошаны кулямётнай чаргой. Загінула яшчэ 8 акаўцаў. «Панурага» пахавалі ў мястэчку Ваверка (Лідскі раён) ля муроў касцёла.

Другая старана дзейнасці АК больш неадназначная і супярэчлівая. Адносіны паміж АК і савецкімі партызанамі, а таксама погляд акаўцаў на пасляваеннае уладкаванне і беларускае пытанне ўвогуле, зразумела, патрабуюць грунтоўнага вывучэння. Пошукі паразумення мелі месца — з боку савецкіх партызанаў і з боку акаўцаў. Асабліва ў першы перыяд пасля з'яўлення ў беларускіх лясах узброеных групаў АК. На спробы ўстанавіць кантакты з камандаваннем савецкіх брыгадаў і атрадаў акаўцы атрымлівалі ўзаемнасць. Так, напрыклад, абмяркоўваўся план сумеснай акцыі па разгрому нямецкага гарнізона ў Лідзе, планавалі сумесную абарону партызанскіх стаянак.

Але з другой паловы 1943 года нацягнутыя адносіны яшчэ больш абвастрыліся, набылі формы ўзброенага супрацьстаяння. Так, 9 лістапада 1943 года падраздзяленне Наднёманскага батальёна вяло бой у раёне мястэчка Жалудок з савецкімі партызанамі на працягу дня. Савецкі атрад вымушаны быў перайсці

праз пераправу на другі бераг Нёмана. Страты з савецкага боку склалі каля 200 чалавек. У выніку раёны Ліды, Шчучына, Валожына і Навагрудскага абводу былі поўнасцю ачышчаны ад савецкіх партызан.

Камендант Навагрудскай акругі АК Януш Праўдзіц-Шляскі адзначае, што фарміраванні гэтай акругі з 1 студзеня 1942 года і да моманту прыходу Чырвонай Арміі правялі 185 баёў і ўзброеных сутычак, з іх 102 — з немцамі, іхнімі паслугачамі, 83 — з савецкімі партызанамі, — 55 і 45% адпаведна [3, с. 79]. Статыстыка больш чым красамоўная. Немцы імкнуліся ўстанавіць кантакт з атрадамі АК, аказаць ім дапамогу зброяй і боепрыпасамі, а затым падштурхнуць да барацьбы супраць савецкіх партызанаў. Такіх сумесных дзеянняў акаўцаў і немцаў у Лідскай акрузе было даволі шмат. Трэба адзначыць: на тэрыторыі Заходняй Беларусі жаўнеры АК адчувалі сябе чужынцамі, яны так і не змаглі пасапраўднаму «зачапіцца» за беларускую зямлю і распачаць баявыя акцыі. Акаўцы запісалі на свой рахунак шэраг несумненных дасягненняў, рэпрэсій супраць мясцовага беларускага насельніцтва, савецкіх партызан і падпольшчыкаў.

Асобным прадметам даследавання з'яўляецца перыд дзейнасці АК супраць устанаўлення савецкай улады і беларускага народа пасля вызвалення Беларусі войскамі Чырвонай арміі. Сведкамі гэтых падзей служаць дакументы з судовай справаздачы «Працэсе 16-ці»: «Толькі у кастрычніку 1944 г. атрадам 'Рагнара' ў вёсцы Любарты забіты лейтэнант Чырвонай Арміі Л. А. Кугляк, абстраляна праязджалая па шашы аўтамашына, прычым забіты два ваеннаслужачыя. У вёсцы Дзітрыкі Лідскага раёна быў павешаны адзін савецкі грамадзянін, у вёсцы Клюкавічы быў расстраляны другі, расстраляны 2 жыхары вёскі Котлава» [4, с. 24].

**Заключэнне.** Мінулі гады, дзесяцігоддзі, на палітычнай картце няма СССР. Час далёка адсоўвае апісаныя падзеі і сцірае сляды. Але беларускі народ ніколі не забудзе ахвяр тэрору, ад каго б ён ні зыходзіў і якімі б лозунгамі ні прыкрываўся. Разглядаючы розныя аспекты дзейнасці Арміі Краёвай на Лідчыне, можна прыйсці да высновы: з аднаго боку, мы павінны аддаць даніну павагі тым удзельнікам Арміі Краёвай, якія змагаліся з фашысцкімі акупантамі, ушанаваць памяць тых, хто загінуў ад нямецкай кулі і застаўся навекі ляжаць у беларускай зямлі, з другога — не могуць быць героямі тыя, хто пасля ліпеня 1944 і аж да 1954 года са зброяй у руках хаваўся ў беларускіх лясах і супрацьстаяў усталяванню савецкай улады. Даследаванне Арміі Краёвай яшчэ раз яскрава сведчыць аб складанасці гэтай гістарычнай тэмы, але яна мае важнае значэнне ў навучальна-выхаваўчым працэссе пры фарміраванні грамадска-палітычных арыенціраў ў складаных сучасных ідэалагічных лабірынтах.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Сямашка Я. І. Армія Краёва на Беларусі. Мінск : Хата, 1994. 270 с.
2. Валаханович И. А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944—1953 гг. : дис. … канд. ист. наук 07. 00. 02. Минск, 1999. 103 с.
3. Ермалович В. И., Жумарь С. В. Огнем и мечом. Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939—1953 гг.). Минск : БелНИЦДААД, 1994. 112 с.
4. Рыбак Н. А. Ликвидация польского антисоветского подполья в западных областях БССР в 1944—1953 гг. // Вест. ГрГУ им. Я. Купалы. Сер. 1, История. Философия. Политология. Социология. 2005. № 1 (30). С. 22—30.



Материал поступил в редакцию 22.04.2015 г.



**УДК 32.01:303**



**М. Б. Елисеева, И. В. Кошелева**

*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*


## РОЛЬ ИНСТИТУТА СЕМЬИ В СОХРАНЕНИИ НАЦИОНАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ БЕЛОРУССКОГО ОБЩЕСТВА

**Введение.** В условиях нарастания вызовов глобализации и продолжающихся системных трансформаций белорусского общества ключевое значение в обеспечении национальной безопасности Республики Беларусь приобретает сохранение национально-культурной идентичности, означающей признание социумом исторически выработанных основополагающих ценностей, придающих ему специфический облик. Разработка актуальной для общества проблемы отвечает цели укрепления белорусской государственности.

**Основная часть.** Социокультурная трансформация как следствие процессов глобализации сильно осложнила формирование идентичности современного человека. В условиях быстро меняющихся социальных, политических, экономических и иных реалий общества сложно говорить об устоявшейся социальной идентичности личности. Современные исследователи пришли к выводу о «кризисе идентичности».


© Елисеева М. Б., Кошелева И. В., 2015